Прачытайце загадку Уладзіміра Мацвеенкі, правільна вымаўляючы гукі [ц’], [ч], падоўжаны [ц]. Адгадайце яе.

Мышак лові**ць**,
ды не кіска ён.
Лісты носі**ць**,
ды не паштальён.
Каб лісе
не трапі**ць** на зубок,
у калю**чы**
скру**цiцц**а клубок.



***Пы́са*** — пярэдняя частка галавы (з губамі і ноздрамі) жывёліны.

## ХІТРУН

*Павел Ткачоў*

Вожык жыў са сваёй матуляй у лесе. Каля магутнага волата дуба засталася ад старога пянька ямка. Вось у гэтай ямцы і быў іх дом.

Вельмі любіла матуля свайго Вожыка і ўсё лічыла яго мале́нькім. Але сам Вожык з гэтым не згаджаўся. Мамы, яны заўсёды лічаць сваіх дзяцей маленькімі. А ў Вожыка іголкі не мяккія, як былі раней, а пругкія, колкія, — паспрабуй крані! Які ж ён маленькі?

Каб здавацца дарослым, Вожык не коціцца, нібы мячык, з горкі, а ідзе не спяшаючыся, паважна. Але гэта не дапамагае. Матуля ўсё роўна не пускае гуляць



Правообладатель Национальный институт образования

аднаго. А сама заўсёды днём спіць. Надакучыла Вожыку — ноччу спі, днём спі.

І вельмі ж яму хочацца прайсці аднаму па сцяжынцы, што вядзе да возера. Падыдзеш да вады — і ўбачыш сваю пыску. Вожык ужо аднойчы любаваўся сабою, калі быў там з мамай. Ён тады зрабіў такі грозны выгляд, што ажно самому страшна стала. Не, ён ужо не маленькі.

Паглядзеў: матуля моцна спіць.

«Давай схаджу на возера, пакуль яна адпачывае», — вырашыў Вожык.

Ён радасна фыркнуў і падаўся да знаёмай сцяжынкі. Вось яна. Цяпер і спяшацца няма чаго. Можна прытаіцца каля старога дрэва і пачакаць, ці пакажацца мышка-нарушка. Або пакаці́цца мячыкам з горкі. Усё роўна матуля не бачыць. І ніхто не будзе гаварыць: «Вожык, не рабі таго, Вожык, не рабі гэтага».





Правообладатель Национальный институт образования

Неўзабаве ён быў каля возера. Дзесьці ў вышыні, у верхавінах дубоў, ліп і бяроз, якія, быццам вартавы́я, сцераглі спакой возера, шумеў вецер. А тут было ціха і так хораша.

Не ўтрымаўся Вожык, скаціўся да вады мячыкам. Бадзёра страсянуў іголкамі — і залюбаваўся сваім адлюстраваннем у вадзе. Нават пра ўсё на свеце забыў. І не заўважыў, як да яго падышла дзяўчынка і нахілілася. Вожык адчуў небяспеку толькі тады, калі косы-хвосцікі дзяўчынкі ледзь не дакрануліся да вады.

Ад страху Вожык хацеў «тукнуць», як маці, калі яна злавалася, але ў яго нічога не выйшла. У той жа момант ён скруціўся ў клубок.

— Ой, які ты прыгожы, — гаварыла дзяўчынка. — Не бойся. Я не пакрыўджу цябе.

Што далей здарыцца з Вожыкам? Ці адпусціць яго дзяўчынка дамоў, да маці?

Яна ўзяла Вожыка на рукі, вынесла на сцяжынку і паклала на зямлю.

— Бяжы, калюка, дамоў, да матулі.

Вожык ляжаў ціха-ціха, ад страху нават і дыхаць перастаў. А потым, калі крокі дзяўчынкі заціхлі, разгарнуўся і што меў сілы пабег дахаты.

— Мама, мама! — закрычаў, цяжка сапучы́, Вожык над вухам матулі, якая яшчэ спа́ла. — Каб ты ведала, як я напалохаў дзяўчынку. Яна да мяне падышла, а я: тук-тук — не чапай, бо я ўжо вялікі. Ды


Правообладатель Национальный институт образования

іголкамі яе, іголкамі. Яна ад мяне наўцёкі... А ты кажаш, што я маленькі.

Матуля паглядзела ў твар сыну. У вачах Вожыка бегалі нейкія агеньчыкі. Ён хітрыў — вельмі ж Вожыку хацелася быць дарослым.

— Не свавольнічай, сынок. Гэта была добрая дзяўчынка. Другая б занесла цябе куды-небудзь. Што б я тады рабіла?..

Матуля гаварыла ціхім жаласлівым голасам. І Вожыку зрабілася сорамна за сваю няўдалую хітрасць.

1. Якую інфармацыю пра жыццё вожыкаў вы пачарпнулі з гэтай казкі? Дзе яны жывуць? Чым харчуюцца?
2. Дакажыце радкамі з твора, што Вожык не лічыў сябе маленькім.
3. Ці апраўдваеце вы ўчынак Вожыка? Чаму?
4. Як дзяўчынка аднеслася да маленькага Вожыка? Як гэта характарызуе яе?
5. Паразважайце, чаму пасля ўцёкаў ад дзяўчынкі Вожык сказаў матулі няпраўду.
6. Як пісьменнік адносіцца да свайго героя? Дакажыце радкамі з тэксту.
7. Падзяліце казку на сэнсавыя часткі. Дайце ім загалоўкі. Падрыхтуйце пераказ твора па плане.

### ПРЫКАЗКІ

- Добрае дзіця бацькоў думкі згадвае.
- У няпраўды ногі кароткія.
- Адзін раз зманіш — другі не паверацъ.


Правообладатель Национальный институт образования